***Святлана Чарняк***

# СЕМАНТЫКА ЛІЧБЫ «СЕМ» У СЛАВЯНСКАЙ МІФАЛОГІІ

Сем – адна з самых моцных па сваёй інфарматыўнасці лічба ў славянскай міфалогіі. Асаблівасць яе ў тым, што ў адрозненне ад большасці лічбаў першай дзесяткі яна не мае свайго апазіцыянера. Магчыма, гэтым тлумачыцца яе амбівалетнасць. Славяне ды іншыя народы свету надавалі лічбе «*сем*» вялікую ўвагу. Напрыклад, у Егіпце гэтая лічба з'яўлялася сімвалам вечнага жыцця і належыць богу Асірысу. Яна таксама з'яўляецца сімвалам творчасці; у Старажытнай Грэцыі лічба «*сем*» лічылася сімвалам сына Зеўса, патрона мастацтва Апалона, які нарадзіўся ў сёмы дзень месяца і ў яго ліры было сем струн [1, с. *339*].

Значэнне лічбы «*сем*», пашырэнне ў сацыяльнакультурнай сферы, як мяркуюць многія даследчыкі, грунтуецца на назіраннях за пэўнымі касмічнымі аб'ектамі і з'явамі. Напрыклад, найбольш выразна на нашым небасхіле бачыцца сузор'е Вялікай Мядзведзіцы (Воз), у якое ўваходзіць менавіта сем зорак. Асобая ўвага, якой надзяляюць лічбу «*сем*», звязана таксама з спадарожнікам зямлі – Месяцам. Месячны цыкл складаецца з чатырох фаз, кожная з якіх дзеліцца на сем дзён. Напрыклад, у Вавілоне кожны сёмы дзень, які абазначаў заключэнне пэўнага этапа месячнага цыкла, быў у гонар бога Месяца Сіна. Гэты дзень лічыўся небяспечным, таму сёмы дзень нядзелі прызначаўся для адпачынку [2, с. *122*].

Гісторыя міфалогіі, культуры і цывілізацыі зведала і пакінула нам у спадчыну сем цудаў свету; у старажытным Кіеве на Падоле стаяла сем выяў асноўных славянскіх багоў. У хрысціянскай традыцыі сустракаюцца сяміглаловыя храмы, а ў падсвечніку ставіцца сем свечак, што сімвалізуе сабой сем хрысціянскіх таінстваў, а таксама сем дзён тварэння свету. З гісторыі астраноміі вядома, што доўгі час зямляне ведалі сем планет, якія ўваходзілі ў Сонечную сістэму [1, с. *339*]. Дарэчы, паўнацэннай сацыяльнай адзінкай працягу роду з'яўляецца сям'я, у структуры якой зноў-такі чуецца сямёрка. А мінімальная колькасць пакаленняў, якую ахоплівала структура Роду, раўнялася сямі (пра чалавека, які добра ведаў сваю радню, казалі: *«Ведае свой род аж да сёмага калена»*) [2, с. *119*].

Лічба «*сем*» суправаджае чалавека ва ўсіх цыклах яго жыцця, напрыклад, на сёмым месяцы ў навароджанага пачынаюць з'яўляцца зубы. Праз 14 месяцаў (7х2) ён пачынаў сядзець, а праз 21 (7х3) – хадзіць. Размаўляць пачынаў пасля 28 месяцаў (7х4). Праз 35 месяцаў (7х5) ён кідае кідае ссаць матчыны грудзі. У 14 гадоў (7х2) чалавек пачынае поўнасцю фарміравацца, а ў 21 (7х3) – перастае расці. Цяжарнасць у жанчыны складае 20 дзён (7х40). Хваробы развіваюцца на працягу сямідзённага цыкла [2, с. *123*]. Такім чынам, лічба «*сем*» кіруе такімі цыкламі і рытмамі, як нараджэнне, развіццё, старэнне і смерць.

Лічба *«сем»* шырока прадстаўлена ў вусна-паэтычнай творчасці і магічнай практыцы народнай медыцыны. Напрыклад, у вясельнай паэзіі (песнях, якія суправаджалі выпяканне каравая) ідзе шматрадовы пералік інгрэдыентаў святочнага печыва: сямі крыніц вадзіца, сямі двароў мукі, сямі гаспадынь соль, сямі курэй яйкі [1; с. *339*]. У беларускіх легендах адлюстраваны асноўныя біблейскія матывы стварэння свету Богам за сем дзён. Сімволікай сямёркі перапоўнена Біблія, касмалогія якой не магла не паўплываць на фарміраванне структуру беларускага народнага хрысціянскага календара, у якім лічба *«сем»* – сакральная: вялікі пост у хрысціян налічвае сем тыдняў, мы ведаем сем смяротных грахоў [2; с. *132*].

Сямёрка літаральна знітавала паміж сабой космас і нашу культуру. Як толькі паветра пасля моцнага дажджу напоўніцца ўзбуджаючым азонам, неба абавязкова расквеціцца падковай шчасця – вясёлкай, якая, па агульнапрынятых уяўленнях, увабала ў сябе сем колераў. Выдатныя шэдэўры музычнага мастацтва таксама створаны на аснове геніяльных камбінацый ўсё тых жа сямі нот [3; с. *132*].

У міфапаэтычнай мадэлі свету лічба *«сем»* прысутнічае ў двух планах: з аднаго боку, як сімвал сінкрэтызаванага хранатопу – часу (вядомы тры яго вымярэнні: мінулае – сучаснасць – будучыня) і прасторы (чатыры бакі свету), – а з другога – верхняй сферы, космасу, які таксама мае сем нябёсаў *(«На сёмым небе ад шчасця»)*. У славянскім казачным эпасе адной з найбольш папулярных з'яўляецца казка пра ваўка, які з'еў сямёра казляня.

Значэнне завершанасці ў сімволіцы лічбы *«сем»* выразна выяўлена ў славянскім звычаі: трэба, каб новая хата сем дзён пастаяла недабудаваная, шэсць дзён у ёй павінны начаваць розныя хатнія жывёлы і толькі на сёмы дзень туды магла пераходзіць сям'я [1; с. *339*]. У сувязі з разгляданым значэннем характэрныя парэміі тыпу «Сем разоў адмер, адзін раз адрэж». Лічба «*сем*» сустракаецца даволі часта ў розных прыказках і прымаўках: *«Сем раз адмер адзін раз адрэж», «Сёмая вада на кісяле», «Сямёра аднаго не чакаюць», «Адзін з сошкай, а семёра з ложкай», «Сем пятніц на нядзеле», «Вераснёвы час – сем надвор'яў у нас», «Не пазнавай сябра ў год, а пазнавай сем гадоў», «Чым сямярых пасылаць, лепш самому пабываць», «Сем спраў у адны рукі не бяруць».*

Фігуравала лічба «сем» і ў павер'ях: *«Забіць ката – сем год шчаця не бачыць»* (ФЭАБ; зап. ад Амяльковіч Г.І. 1926 г.н. з в. Заазер'е Пінскага р-на). Жыхарка в.Заазер'е Пінскага р-на, Брэсцкай вобл. Кузьміч Ядзвіга Мікалаеўна, паведаміла мне, што дух мерцвяка знаходзіцца каля магілы сем дзён. Нававроджанаму дзіцяці даюць імя на працягу сямі дзён з дня нараджэння.

Вераць, што сёмы сын сёмага бацькі валодае магічнымі здольнасцямі. Лічба *«сем»* прадстаўлена ў варажбе. Нярэдка яна сімвалізуе сямейны дабрабыт, шанцаванне, часам яе называюць лічбай анёла. У сучаснай мантычнай практыцы гэтая лічба можа абазначаць сустрэчу. Так, Кузьміч Ядзвіга Мікалаеўна расказала, што калі вы пабачылі лічбу «*сем*» на нумары аўтамабіля або аўтобуса, то гэта можа азначаць: адна семёрка – нейкія перажыванні; дзве семёркі – сустрэчу са знаёмым; тры – сустрэчу с жанчынай; чатыры сямёркі – нядольнасць вырашыць нейкую канфліктую сітуацыю.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У народных тлумачэннях сноў лічба «*сем*» была добрым знакам. Шмат сямёрак – сяброўства некалькіх сямейных пар. Сямёрка або размова аб сямі рэчах, днях і г.д. у сне – прадвеснік шчасця, удалай вандроўкі. Між тым у дадзеным выпадку маглі актуалізавацца апазіцыі «малы/вялікі», «многа/мала», «тлусты/худы» і інш. Лічылі: калі прыснілася вялікая лічба «*сем*», то яна абазначае сямейны дабрабыт, а калі маленькая – перажыванні ў сям'і. Негатыўнае значэнне мела разгляданая лічба ў наступным кантэксце: калі прысніцца сем худых кароў – трэба чакаць хваробу. Аднак доўга яна не прадоўжыцца – каля тыдня (ФЭАБ; зап. ад Кузьміч Я.М. 1946 г.н. з в. Заазер'е Пінскага р-на). Цікава адзначыць, што ў духоўнай спадчыне беларусаў і іншых славян можна сутыкнуцца з такімі сітуацыямі, калі для ўзмацнення ўдзеяння або абавязковага дасягнення жаданага выніку тая ці іншая лічба не памнажаецца, а падвойваецца, напрыклад лічба 7 ператвараецца ў 77, а ў некаторых выпадках і ў 777. У замовах ужо здвоеная сямёрка выступае сімвалам канчатковасці: *«Сабраліся вуж і вужыцы, гады і гадзіцы – семдзесят сем»* [2, *сс. 119-132*], абазначае ўсеахопнасць.

Такім чынам, можна сцвярджаць, што лічба *«сем»* з'яўляецца сакральна вызначаным, высокасеміятызаваным чынікам славянскай міфалогіі, праз які ўвасабляецца мадэль свету, кадзіруюцца астранамічныя вобразы і асноўныя канцэпты сацыяльнай (сямейна-родавай) арганізацыі грамадства. Сямёрка з яе значэннямі завершанасці і нябеснага ўзвышэння магла «прыглушыць» лічбы-суседзі, але не нейтралізавала іх цалкам. А магчыма, што лічбы 6 і 8 былі спалучаны з тымі сферам дзейнасці чалавека, якія засталіся тайнай для тых, хто не прайшоў ініцыяцыю [2, *с. 119*]. Сімволіка лічбы «сем» вызначаецца шматзначнасцю, яна лічыцца і святой, і боскай, і магічнай, і шчаслівай. Праз сімволіку гэтай лічбы мадэлююцца час і прастора, транслюецца шыфраграма акта першатварэння (касмаганічны і касмалагічны аспекты). Гэтым, верагодна, абумоўлена яе шырокае выкарыстанне ў народнай медыцыне, магіі, варажбе і інш.

**Заўвагі:**

*****1. У артыкуле выкарыстаны матэрыялы, запісаныя аўтарам.

ФЭАБ – Фальклорна-этнаграфічны архіў фальклорна-краязнаўчай лабараторыі БрДУ імя А. С. Пушкіна.

**Спіс літаратуры**

1. Крук, І.І. Сем / І.І. Крук // Міфалогія беларусаў : Энцыклапедычны слоўнік / склад. І. Клімковіч, В. Аўтушка ; навук. рэд. Т. Валодзіна, С. Санько. – Мінск : Беларусь, 2011. – С. 76.
2. Крук, Я. Сімволіка беларускай народнай культуры / Я.Крук. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2001. – 486 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ